# Іван Гаўрылавіч Чыгрынаў



Я не скажу, што бачыў свет,
Але на моры і на сушы
Жывых людзей жывыя душы
Ў маёй пакінулі свой след...

Партрэт Івана Чыгрынава (Таццяна Ханіна)



# Біяграфія

- Іван Гаўрылавіч Чыгрынаў нарадзіўся **21 снежня 1934 года** ў вёсцы Вялікі Бор Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.
- Вайна, якую будучы пісьменнік перажыў у роднай вёсцы, дала яму багата ўражанняў, а пазней вызначала тэматыку яго твораў.
- Сямігодку І. Чыгрынаў закончыў у сваёй вёсцы, а сярэднюю школу ў Саматэевічах, радзіме Народнага паэта А. Куляшова, што пэўным чынам паўуплывала на захапленне літаратурай. Гэтаму актыўна спрыяла і вучоба на аддзяленні журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1952-1957).

# Біяграфія

- Пасля завяршэння вучобы І. Чыгрынаў працуе рэдактарам, а затым і загадчыкам рэдакцыі выдавецтва Акадэміі Навук, рэдактарам аддзела публіцыстыкі і нарыса часопіса “Полымя”. У 1975-1986 гадах пісьменнік працаваў у апараце Саюза пісьменнікаў, займаючы пасады намесніка старшыні, а затым сакратара праўлення. З 1987 года ён узначальваў Беларускі фонд культуры, а таксама быў рэдактарам часопіса “Спадчына”.








# Біяграфія

- І. Чыгрынаў займаў і адказныя дзяржаўныя пасады. Ён выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета рэспублікі, быў старшынёй камісіі па нацыянальных пытаннях і міжнацыянальных адносінах. У 1978 годзе ў складзе беларускай дэлегацыі ўдзельнічаў у рабоце чарговай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН.
- У 1994 годзе яму было прысвоена ганаровае званне “Народны пісьменнік”.
- Не стала І. Чыгрынава 5 студзеня 1996



# Творчасць



- Першыя вершы пісьменніка з'явіліся ў друку яшчэ ў 1952 годзе, але ўжо ў студэнцкія гады ён стала перайшоў на прозу. Яго першае апавяданне было надрукавана ў газеце "Чырвоная змена" ў 1957 годзе. У 60-я гады ён зарэкамендаваў сябе як адзін з цікавых і арыгінальных навелістаў, рэгулярна змяшчаючы свае творы на старонках перыядычнага друку. Сталасць празаіка пацвердзілі зборнікі "Птушкі ляцяць на волю" (1965), "Самы шчаслівы чалавек" (1967), "Ішоў на вайну чалавек" (1973).

- І. Чыгрынаў пераважна заглыбляўся ў той аспект вайны, які быў звязаны з вёскай, адкуль усе мужчыны пайшлі на фронт, а ў хатах засталіся жанчыны, дзеці ды старыя людзі. “Але былі людзі не толькі на вайне, але і ў вайне. Мяне больш за ўсё займала тое, як яны паводзілі сябе пад акупацыяй”, – гаварыў пісьменнік. У яго ёсць апавяданне пра пачатак вайны (“Ішоў на вайну чалавек”), пра сустрэчу салдат на вызваленай зямлі (“Бульба”), пра ўплыў ваенных падзей на лёсы людзей у пасляваенны час (“За сто кіламетраў на абед”, “Дзівак з Ганчарнай вуліцы”, “У ціхім тумане”).



- Найбольш характэрным для пісьменніка было апавяданне “Варажба”, якое стала адным з раздзелаў рамана “Плач перапёлкі” (1972).
- Затым былі напісаны раманы “Апраўданне крыві” (1977), “Свае і чужынцы” (1984), “Вяртанне да віны” (1991), “Не ўсе мы згінем” (1996). У раманнай пенталогіі назіраецца імкненне ахапіць увесь перыяд жыцця людзей у час вайны – ад лета сорак першага да лета сорак чацвёртага, да вызвалення Беларусі. Усім зместам сваіх твораў І. Чыгрынаў сцвярджаў ідэю пра няскоранасць і неўміручасць народа.



- У 1980-1990-я гады пісьменнік звярнуўся да драматургіі. Ён напісаў звыш дзесяці п’ес, у большасці сваёй прысвечаных мінуламу нашай радзімы, пераломным гадам у яе гісторыі. “Я адчуў, – зазначаў І. Чыгрынаў, – што цяпер вельмі патрэбны творы, якія павінны рэканструяваць гісторыю нашага народа. Патрэбны жывыя ілюстрацыі. Не ўслед за гісторыкамі, а ў першыню самім дадаваць гістарычныя пласты і ўвасабляць у мастацкія вобразы”. Драматычныя творы якраз і цікавы жаданнем сказаць сваё слова пра многія вызначальныя падзеі (“Звон – не малітва”, “Следчая справа Вашчылы”, “Чыстыя рэкі і мутныя воды”, “Толькі мёртвыя не вяртаюцца” і іншыя).

- Пісьменнік выступаў у друку з артыкуламі аб надзённых праблемах літаратурнага жыцця, аб чым сведчыць ужо назва кніг, у якіх сабраны яго выступленні і артыкулы – “Новае ў жыцці, новае ў літаратуры” (1983), “Паміж сонцам і месяцам. Роздум над жыццём, культурай і літаратурай” (1994). І. Чыгрынаў быў адным з аўтараў сцэнарыя шматсерыйнага тэлефільма “Руіны страляюць” 1977).







Прайсці
ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ
ЯКУБ КОЛАС 1
ЯКУБ КОЛАС 4
ПОЛЫМЯ